***<u>Вэбінар</u>***

*Тэма "Некаторыя праблемныя аспекты вывучэння раздзела "Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія" пры падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання"*

1.Актуальнасць вывучэння раздзела "Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія. Праблемныя аспекты марфемнага і словаўтваральнага аналізу слоў.

Раздзел "Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія" вывучаецца ў шостым класе, але, па сутнасці, з'яўляецца скразным у школьным курсе і спасцігаецца на ўсіх этапах вывучэння курса беларускай мовы.

Пры падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання сістэмнае, глыбокае веданне гэтага раздзела проста неабходна, бо ён у першую чаргу звязаны з марфалогіяй і арфаграфіяй, бо, як вядома, адзін з прынцыпаў беларускай арфаграфіі—марфалагічны, а апора на гэты прынцып патрабуе хутка і беспамылкова вызначаць марфемы (часткі слоў).

Праца па словаўтварэнні дае магчымасць глыбей авалодаць і лексікай, бо словаўтварэнне—асноўны сродак папаўнення лексічнага складу мовы.

Цесна звязана словаўтварэнне і з сінтаксісам, паколькі многія складаныя словы ўтвараюцца на аснове словазлучэнняў.

Аднак, як падказвае вопыт працы з абітурыентамі, вывучэнне раздзела "Склад слова і словаўтварэнне" ў школьным курсе мае істотныя недахопы. Сярод праблемных аспектаў, лічу, неабходна спыніцца на наступных.

**1**.Абітурыенты сустракаюцца з цяжкасцямі ў размежаванні словаўтваральнага і марфемнага разбораў слоў. Імі забываецца тое, што марфемны разбор—гэта правільны падзел слова на часткі (марфемы), а словаўтваральны—вызначэнне словаўтваральнай базы, спосабу словаўтварэння. Але марфемны і словаўтваральны разборы цесна звязаны паміж сабой, бо беспамылковае вызначэнне марфемнага складу слова дапамагае вызначыць спосаб утварэння таго ці іншага слова. Так, напрыклад, словы ўзмор'е, сузор'е ўтвораны прыставачна-суфіксальным спосабам, бо ў гэтых словах ёсць гукавы суфікс[й], слова Пяцігор'е ўтворана складана-суфіксальным спосабам, бо яно таксама мае гэты суфікс.

З цяжкасцю абітурыенты вызначаюць спосабы ўтварэнне слоў *прыгарадны, лесапаркавы, выпраменьванне, ураджай* (спосаб утварэння суфіксальны). І тут неабходна спыніцца на тым, што кожнае наступнае слова мае ў словаўтваральным ланцужку мае "мае вышэйшы матываваны пункт адліку".

<u>Практычнае заданне</u>. Запішыце словы, ад якіх утварыліся наступныя:

Зімовы, зімаванне, зімні, зімна, па-зімоваму, зазімак, зіміца, зімка, зімовішча(звя-
роў).

**2**.Прынцыпы падзелу слоў на марфемы паводле іх часцінамоўнай прыналежнасці і пэўных словаформаў (на практычным матэрыяле). Фармаўтваральння і словаўтваральныя афіксы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пры падзеле слоў на часткі (марфемы) перш за ўсё трэба памятаць, што ўсе яны падзяляюцца на зменныя і нязменныя.Нязменныя –гэта тыя, якія не маюць і не могуць мець канчатка (інфінітыў дзеяслова, нескланяльныя назоўнікі, прыслоўе і дзеепрыслоўе). Канчатак—формазменная частка слова, якая выражае пэўныя граматычныя характарыстыкі слова. Нулявы канчатак расцэньваецца як матэрыяльна выражаны і лёгка ўзнаўляецца пры змене словаформы. Так, напрыклад, слова сын, чытаў маюць нулявыя канчаткі, бо змене формы слова лёгка ўзнаўляюцца: сын—сына, чытаў—чытала.У апошнім прыкладзе варта прыгадаць, што форма роду дзеяслова характэрна для прошлага часу адзіночнага ліку, -л- і -ў з’яўляюцца суфіксамі (гістарычнае чаргаванне).

Корань слова, як гэта адзначалася ў школьным курсе, выражае лексічнае значэнне слоў і можа мець розныя фанетычныя варыянты.

Прапануецца разгледзець і падзяліць на марфемы наступныя гнёзды слоў з наступным тлумачэннем:

1)г-ну-ць (інфінітыў), гн-уць (3-я асоба множны лік, цяперашні час), раза-г-ну-ц-ца (інфінітыў), раза-гн-уц-ца (3-я асоба множны лік, будучы час), раз-гін-а-нн-е;

2)сме-х, сме-ш-н-ы, сме-ш-н-а, рас-смя-ш-ы-ць, смя-ю-ся;

3)холад, холад-н-а, халадз-і -ць, халадз-і-льн-ік;

4)раб-от-а, раб-і-ць, з-рабл-ю.

Можна прапанаваць падзяліць на марфемы словы не-да-сяг-а-льн-ы, па-з-ры-ва-ць, пера-больш-ва-нн-е, а таксама знайсці словы, у якіх чатыры суфіксы : гадзіннік, выпрабавальнік, патрабавальна, чарнічнік, загазаванасць, зруйнавацца, барацьбіт.

Пры праходжанні тэмы “Формаўтваральныя і словаўтваральныя афіксы” неабходна звярнуць увагу на наступныя формаўтваральныя прыстаўкі і суфіксы:

1)суфіксы пры дапамозе якіх утвараюцца ад дзеясловаў дзеепрыметнікі і дзеепрыслоўі

(тут варта нагадаць, што дзеепрыметнікі і дзеепрыслоўі не самастойныя часціны мовы, а толькі дзеяслоўныя формы, таму і суфіксы, пры дапамозе якіх яны ўтвараюцца ад дзеясловаў—формаўтваральныя); калі дзеепрыметнікі утвараюцца ад дзеясловаў на -іць, -ыць або –ці, то ў дзеепрыметніку адзін суфікс –ен- або –ан-: скасіць—с-кош-ан-ы, скласці—складз-ен-ы, але пратаптаць—пра-тапт-а-н-ы, абсыпаць—аб-сып-а-н-ы; пры утварэнні дзеепрыслоўяў незаконачанага трывання з дапамогай суфіксаў –учы (-ючы), -ачы(-ячы) неабходна зазначыць, што дзеепрыслоўі ўтвараюцца ад асновы дзеясловаў цяперашняга часу: пішуць—пішучы, адпачываюць—адпачываючы, бачаць—бачачы, косяць—косячы (у апошніх выпадках многія абітурыенты замест формаў цяперашняга часу падаюць іншыя формы);

2)суфіксы інфінітыва дзеяслова: бег-чы, ес-ці, да-ць;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3)прыстаўкі і суфіксы для ўтварэння простай формы вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў і прыслоўяў: прыгожы—прыгаж-эйш-ы, най-прыгаж-эйш-ы, прыгожа—прыгаж-эй, най-прыгаж-эй;
4) суфіксы –л- і –ў у дзеясловах прошлага часу: казаў—казала, чытаў—чытала;
5) суфіксы –ну- і –ва- для ўтварэння формаў трывання: крычаць—крыкнуць, заварыць—заварваць.

Словаўтваральныя афіксы змяняюць значэнне слова: маральны—амаральны, пісаць—спісаць.

Заўвага : постфіксы, як правіла, з'яўляюцца словаўтваральнымі:мыць—мыцца, купаць—купацца.

Лічу, што вывучэнні раздзела "Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія"неабходна адзначыць, што дзеяслоў ў сучаснай беларускай мове мае чатыры формы:

1)інфінітыў, 2) спрагальныя формы (змена дзеяслова па асобах і ліках), 3)дзеепрыметнік, 4) дзепрыслоўе. Гэта неабходна для выканання задання на размежаванне зменных і нязменных формаў дзеяслова (зменныя—дзеепрыметнік і спрагальныя формы, нязменныя—інфінітыў і дзеепрыслоўе).

Прапануецца вызначыць зменныя формы дзеясловаў : аформіўшыся, заспяваю, наведаны (музей), даклейваць, верыў, хваляць, дабіраючыся, друкаваў.

У пачатку вэбінара зазначалася, што словаўтварэнне звязана з марфалогіяй і правапісам. У якасці прыклада хочацца прывесці прыклады на адрозненне прыстаўкі неда- і адмоўя не. Прыстаўка неда-, як вядома, пішацца ў назоўніках і дзеясловах, калі гаворка ідзе пра неадпаведнасць патрэбнай норме. Ад дзеясловаў з прыстаўкай неда-лёгка ўтвараюцца назоўнікі з такой жа прыстаўкай (бяссуфіксным або суфіксальным спосабам) : недабраць—недабор, недасаліць—недасол, недабачваць—недабачванне, чаго нельга сказаць пра правапіс дзеясловаў з адмоем не: не дайсці да канца вёскі, не дачытаць кнігу да канца (нельга ўтварыць назоўнікі ад дзеясловаў)

Заўвага : замена прыстаўкі неда- на прыстаўку –пера- не заўсёды спрацоўвае : недасол—перасол, але недабачванне, недачуванне (нельга сказаць перабачванне, перачуванне).

**3**. Асаблівасці словаўтварэння ў беларускай мове.

Усе спосабы словаўтварэння падзяляюцца на марфалагічныя (марфемныя) і немарфалагічныя (немарфемныя). Да марфалагічных адносяцца прыставачны, суфіксальны, прыставача-суфіксальны, постфіксальны, прыставачна-постфіксальны, прыставачна-суфіксальны-постфіксальны, суфіксальна-постфіксальны, бяссуфіксны, прыставачна-бяссуфіксны, складанне (у тым ліку і абрэвіяцыя). Сярод абрэвіятур адрозніваюць літарныя і гукавыя. Род літарных абрэвіятур вызначаецца па апорным слове : БДПУ(м.р.), СНД (ж.р.), СССР (м.р), род гукавых абрэвіятур, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

скланяюцца—мужчынскі : ЛіМ—у ЛіМе, ЦУМ—у ЦУМе, а якія не скланяюцца—вызначаецца па апорным слове : ААН (ж.р.), МКАД (ж.р.).

Да немарфалагічных (немарфемных) спосабаў словаўтварэння ў першую чаргу трэба аднесці пераход слоў з адной часціны мовы ў другую і семантычны (пераасэнсаванне значэння слова). Напрыклад, даволі часта прыметнікі і дзеепрыметнікі пераходзяць у назоўнікі: Маладая сыпанула жменю цукерак (былы прыметнік стаў назоўнікам, у сказе выконвае ролю дзейніка). У шпіталь прывезлі раненых (дзеепрыметнік стаў назоўнікам, у сказе выконвае ролю дапаўнення). Пры семантычным спосабе слова набывае іншае значэнне : ручка (дзіцяці)—ручка (для пісьма), ножка (чалавека)—ножка (крэсла).

Заўвага У словах ручка (для пісьма) і ножка (крэсла) асновы з’яўляюцца невытворнымі.

Практычнае заданне. Вызначыць спосаб утварэння наступных слоў : разлад, прысвоіць, нялёгкі, нялёгка, абваднение, раззбраенне, падмурак, прыезд, пасаджаны, квітнеючы (дзеепрыслоўе), другакурснік, сузор’е, Прыволле, трохкутнік, пячэнне, трох павярховы, аднайменны, дзяржюрвыдавецтва.

**4**. Правапіс складаных, складаскарочаных слоў :

1)правапіс ***о, а*** ў складаных словах : чарнабровы, але чорнавалосы ( калі націск падае не на першы склад другой часткі складанага слова, то ў першай частцы ўзнікае пабочны націск і пад націскам пішацца о);

2) правапіс ***е, ё*** ў складаных словах : медагонка, але мёдаварэнне, ледарэз, але лёдадрабілка (у першай частцы пад націскам пішацца ё (гук [о]) , бо ў другой частцы націск падае не на першы склад);

3) правапіс злучальных галосных ***е,я*** ад пераднаціскнога становішча : зернесушылка, зернявозка;

4) часткі ***радые(-я)/радыё*** (радыё пішацца нязменна, калі абазначаецца тое, што мы слухаем: радыёперадача, радыётрансляцыя, але радыебіялагічны, радыяхімія ( у апошніх прыкладах ад пераднаціскнога становішча);

5) правапіс частак ***велік-/вялік-*** залежыць ад націску ў другой частцы слова (калі націск падае не напершы склад другой часткі, то ў першай пішацца я : Вялікабрытанія, але велікарускі, велікасвецкі);

6) частка ***паў-*** з агульнымі назвамі пішацца разам, з уласнымі праз злучок : паўгорада, паўвёскі, але паў-Баранавіч, паў-Тарасава; частка ***поў-*** пішацца толькі ў словах поўнач, поўдзень;

7) часткі ў складанаскарочаных словах пішуцца так, як яны пісаліся б у поўным слове: прафкам (прафсаюзны камітэт), рыбгас (рыбная гаспадарка);

8) у складанаскарочаных словах перад ётавымі галоснымі апостраф не пішацца : дзяржюрвыдавецтва, дзетяслі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ